**Праект.** У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў рамках цыкла інтэрактыўных лекцый-канцэртаў «Музычная спадчына Беларусі ў прасторы сучаснай культуры» адбылася прэзентацыя ўнікальнага выдання — першага тома «Анталогіі Нацыянальнай харавой спадчыны Беларусі», прысвечанага нацыянальнай спадчыне ў сучаснай кампазітарскай і выканальніцкай практыцы, а таксама канцэпцыі гібрыднага выдання нотнага матэрыялу. Між тым на лекцыі-канцэрце прадставілі творы сучасных кампазітараў, інспіраваныя ўзорамі нацыянальнай харавой спадчыны. Удзелена ўвага мастацкаму адкрыццю ў музыцы ў галіне інтэрпрэтацыі арыгіналаў.